**ЗАЯВА**

**Моладзевага кліматычнага савету Беларусі**

**прысвечаная да 30-й Канферэнцыі Бакоў Канвенцыі аб змене клімату (COP30)**

Мы, прадстаўнікі беларускай моладзі, беларускі і беларусы ва ўзросце ад 18 да 30 гадоў, заклапочаныя зменай клімату:

усведамляем, што змена клімату патрабуе неадкладных і мэтанакіраваных дзеянняў — як для прыстасавання да новых умоў, так і для змяншэння яе негатыўных наступстваў. Як пакаленне, якое будуе будучыню, мы адчуваем адказнасць за тое, каб планета засталася ўстойлівай і прыдатнай для жыцця для нас і для наступных пакаленняў.

бачым, што наступствы кліматычных змен ужо становяцца рэальнасцю, і без своечасовых рашэнняў крызіс будзе толькі паглыбляцца. Асабліва востра гэтыя наступствы адчуваюць маладыя людзі, якія ўжо сутыкаюцца з выклікамі, што ўзнікаюць у выніку змены клімату.

пацвярджаем, што права на спрыяльнае навакольнае асяроддзе з'яўляецца неад'емнай часткай правоў чалавека — асабліва для маладых людзей, чыя будучыня непасрэдна залежыць ад стану планеты. Мы заклікаем дзяржаву ў большай ступені пацвярджаць і абараняць гэта права, а таксама шукаць пацвярджэнне сярод людзей таго, як змена клімату ўжо ўплывае на Беларусь — праз надвор'е, эканоміку, здароўе і якасць жыцця. Важна крытычна ставіцца да наратываў, якія сцвярджаюць, што змена клімату не існуе, а дзейнасць, накіраваная на яе вырашэнне, з'яўляецца махлярствам. Такія заявы падрываюць глабальныя і нацыянальныя намаганні па пабудове/забяспецы кліматычнай справядлівасці і супярэчаць навуковым фактам.

падкрэсліваем, што барацьба з кліматычным крызісам не можа абмяжоўвацца асабістай адказнасцю кожнага чалавека ці толькі моладдзю. Патрэбныя комплексныя дзеянні на ўзроўні дзяржавы — палітыкі, стратэгіі і канкрэтныя рашэнні, якія спрыяюць пераходу да ўстойлівай эканомікі.

заклікаем дзяржаўныя органы Рэспублікі Беларусь (уключаючы Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, Нацыянальную акадэмію навук, Савет Міністраў, Саветы дэпутатаў, Міністэрства архітэктуры і будоўлі, Міністэрства ЖКГ, Міністэрства аховы здароўя, Міністэрства лясной гаспадаркі, Міністэрства па надзвычайных сітуацыях, Міністэрства сельскай гаспадаркі, Міністэрства энергетыкі, Міністэрства транспарту і камунікацый, Міністэрства эканомікі, Міністэрства адукацыі, Міністэрства прамысловасці);

беларускія дэмакратычныя сілы (уключаючы офіс Святланы Ціханоўскай, Каардынацыйную раду);

беларускую грамадзянскую супольнасць у Беларусі і за мяжой, экспертную і акадэмічную супольнасці, беларускія медыя, беларускі бізнес-сектар, удзельнікаў і ўдзельніц 30-й Канферэнцыі Бакоў Канвенцыі па змене клімату (COP30):

**Адукацыя, інфармаванне насельніцтва па пытаннях змены клімату**

Неабходна пашырыць вывучэнне змены клімату на ўсіх узроўнях адукацыі — ад пачатковай школы да ўніверсітэтаў. Сам факт існавання асобных ініцыятыў, як праекты ПРААН («Климатическое образование в целях продвижения ЦУР и продвижения климатической повестки (Климатическая шкатулка)» и «Глобальное климатическое обещание – От обязательства к результату – Беларусь»), не гарантуе глыбокага разумення праблемы ў школьнікаў і моладзі. Для рэальнага ўплыву патрабуецца палітычная воля і сістэмнае ўключэнне кліматычнай тэматыкі ў адукацыйныя праграмы.

Важна падкрэсліць, што барацьба з кліматычным крызісам не можа абмяжоўвацца асабістай адказнасцю кожнага чалавека ці толькі моладдзю. Патрэбныя комплексныя дзеянні на ўзроўні дзяржавы — палітыкі, стратэгіі і канкрэтныя рашэнні, якія спрыяюць пераходу да ўстойлівай эканомікі.

Моладзь павінна быць уключаная ў працэсы прыняцця рашэнняў, якія тычацца клімату і экалагічнай палітыкі. Неабходна прадугледзець адкрыты набор у моладзевыя групы, кансультацыйныя саветы і іншыя пляцоўкі, а таксама магчымасць удзелу анлайн, для ўсёй беларускай моладзі незалежна ад месца пражывання, у тым ліку для моладзі, якая выехала за межы краіны. Такі падыход дапаможа улічыць меркаванні і патрэбы меркаванняў і патрэб шырокага кола маладых людзей.

Моладзевыя групы і ўдзельнікі дыялогу павінны адлюстроўваць разнастайнасць беларускага грамадства — па паходжанні, вопыце, рэгіёне, сацыяльным становішчы і поглядах. Гэта можа быць арганізавана праз моладзевыя парламенты, саветы пры дзяржаўных структурах і іншыя платформы ўдзелу.

Важна шырэй раскрываць тэмы кліматычнай міграцыі і ўплыву змены клімату на найбольш уразлівыя групы насельніцтва — моладзі, сельскіх жыхароў, людзей з інваліднасцю, зняволеных, пажылых людзей і іншых. Гэтыя аспекты павінны быць прадстаўлены ў адукацыйных і інфармацыйных матэрыялах, якія распрацоўваюцца ў краіне.

Павышэнне дасведчанасці маладых людзей аб змене клімату патрабуе шматбаковага падыходу. Варта выкарыстоўваць сучасныя формы камунікацыі — сацыяльныя сеткі, майстар-класы, моладзевыя фестывалі, палявыя ўрокі, паходы, а таксама праграмы нефармальнай адукацыі з практычнай накіраванасцю.

**Удзел грамадскасці і доступ да інфармацыі**

Беларусь павінна зрабіць усё магчымае, каб аднавіць сваё ўдзел у Орхускай канвенцыі, якая гарантуе права грамадзян на доступ да экалагічнай інфармацыі, удзел у прыняцці рашэнняў і доступ да правасуддзя ў экалагічных пытаннях. Гэта стане важным крокам для ўмацавання даверу паміж грамадствам і дзяржавай, а таксама для развіцця празрыстай і адказнай кліматычнай палітыкі.

Асаблівую ўвагу неабходна надаць моладзі — забяспечыць для яе адкрыты, зразумелы і вольны доступ да кліматычнай інфармацыі, даследаванняў і афіцыйных справаздач. Важна, каб гэтая інфармацыя была прадстаўлена на дзяржаўных мовах.

Кліматычную інфармацыю трэба адаптаваць пад узрост, адукацыйны ўзровень і патрэбы розных груп грамадзян, каб забяспечыць высокі ўзровень разумення праблемы і магчымасць паўнавартаснага ўдзелу.

Мы таксама заклікаем праводзіць міждысцыплінарныя даследаванні, якія б вывучалі не толькі фізічныя і эканамічныя аспекты змены клімату, але і тое, як яны ўплываюць на іншыя аспекты жыцця людзей у Беларусі — іх здароўе, дабрабыт, сацыяльнае жыццё і адчуванне бяспекі. Важна фармаваць уласнае, беларускае разуменне кліматычнай сітуацыі, а не кіравацца антынавуковымі наратывамі, якія адмаўляюць існаванне кліматычнага крызісу або дыскрэдытуюць працу, скіраваную на яго вырашэнне.

**Міжнароднае супрацоўніцтва па пашырэнню правоў і магчымасцей у галіне клімату**

**Для ўладаў Беларусі:**
Неабходна павысіць рэальны ўзровень уключанасці Беларусі ў міжнародную кліматычную палітыку. Гэта азначае актыўны ўдзел у глабальных дыялогах, супрацоўніцтва з міжнароднымі інстытутамі і імкненне да выканання міжнародных кліматычных абавязацельстваў.

Асобную ўвагу варта надаць удзелу моладзі. Беларускую моладзь трэба сістэмна ўключаць у працэс прыняцця рашэнняў на міжнародным узроўні — у тым ліку праз дакладнае вызначэнне яе правоў, ролі і рэгламенту ўдзелу ў міжнародных перамовах па клімаце. Неабходна таксама прадугледзець фінансавыя і арганізацыйныя рэсурсы для падтрымкі ўдзелу маладых прадстаўнікоў Беларусі ў гэтых працэсах.

**Для міжнародных партнёраў:**
Заклікаем працаваць над уключэннем беларускіх недзяржаўных і некамерцыйных арганізацый у міжнародную кліматычную палітыку як паўнапраўных прадстаўнікоў грамадзянскай супольнасці Беларусі. Важна прызнаць прадстаўнікоў дэмакратычных сіл Беларусі роўнымі ўдзельнікамі ў міжнародных дыскусіях і рашэннях, якія датычацца змены клімату і кліматычнай справядлівасці.

**Для дэмакратычных сіл Беларусі:**
Рэкамендуем прызначыць дарадцаў па кліматычнай палітыцы, адказных за падрыхтоўку чарнавікоў будучых рэформ у сферы клімату, а таксама за наладжванне супрацоўніцтва з заходнімі партнёрамі і міжнароднымі кліматычнымі платформамі.

Неабходна прыняць палітычнае рашэнне аб распрацоўцы кліматычнай стратэгіі новай Беларусі — у дакуменце павінна быць акрэслена пакрокавае бачанне справядлівага пераходу краіны да ўстойлівай і нізкавугляроднай эканомікі з актыўным удзелам моладзі і грамадзянскай супольнасці.

**Мы — моладзь Беларусі, якая патрабуе кліматычнай справядлівасці.**
Мы добра разумеем тэорыю кліматычных змен, але сёння ў Беларусі амаль немагчыма займацца практычнай дзейнасцю ў гэтай сферы. Дзяржава не ўспрымае кліматычны крызіс як сістэмную пагрозу і часта падмяняе сапраўдныя кліматычныя дзеянні павярхоўнымі наратывамі пра «скарачэнне адходаў» або «асабістую экалагічную адказнасць», што не мае прамога дачынення да барацьбы са зменай клімату.

Тым часам Беларусь ужо адчувае наступства кліматычных змен: усё часцей назіраюцца рэзкія перапады тэмператур, паводкі, засухі і іншыя экстрэмальныя з’явы. Ад гэтага пакутуюць грамадзяне, чыя інфраструктура і сістэмы забеспячэння не гатовыя да такіх

умоў. Кліматычныя змены — гэта не далёкая праблема, а крызіс, які ўжо адбываецца і патрабуе ўдзелу ўсіх бакоў: дзяржавы, бізнесу, навуковай супольнасці, грамадскіх арганізацый і саміх грамадзян.

Мы не прымаем сцвярджэнні, што дзяржава нібыта не можа дзейнічаць без падтрымкі донарскіх сродкаў. Як мінімум, у яе ёсць магчымасць мяняць заканадаўства, удасканальваць экалагічную палітыку і працаваць над інфармаваннем насельніцтва. Калі ж грамадзянін і яго дабрабыт стануць сапраўдным прыярытэтам для ўлады, то знойдуцца і ўнутраныя рэсурсы, і фінансаванне для кліматычных дзеянняў.

**Беларусь у кліматычна справядлівым свеце — гэта краіна, дзе рашэнні прымаюцца праз адкрыты дыялог паміж дзяржавай, грамадствам і моладдзю; дзе эканамічнае развіццё не супярэчыць захаванню прыроды, а сацыяльная палітыка забяспечвае годнае жыццё для ўсіх, у тым ліку найбольш уразлівых груп. Гэта краіна, якая інвестуе ў адукацыю, аднаўляльную энергетыку, зялёныя тэхналогіі і экалагічную інфраструктуру, развівае мясцовыя супольнасці і падтрымлівае ўдзел моладзі ў прыняцці рашэнняў. Беларусь будучыні — гэта краіна адказнасці, празрыстасці і ўзаемнай павагі, дзе кліматычная справядлівасць з’яўляецца асновай дзяржаўнай палітыкі і часткай нацыянальнай ідэнтычнасці.**